КОНТРОЛЬНЫ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________ А.В. Макоўчык
"21" 06 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-31-2-44/вуч.

# ПРАКТЫКУМ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура)**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0113-02-2023 (___.___.______, №_____), вучэбнага плану спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура)

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:
Н.А.Радзіваноўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
М.Р.Прыгодзіч, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;
А.П.Жыганава, дацэнт кафедры беларускай і зарубежнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА**
Дырэктар
ДУА "Гімназія № 18 г. Мінска" ____________ Ю.В.Новік

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 11 ад 30.05. 2023 г.)

Загадчык кафедры ____________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 6 ад 21.06. 2023 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне “Практыкум па беларускай мове” прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах спецыяльных дысцыплін. Ад папярэдняга тыпу вучэбнай праграмы яе адрозніваюць абноўлены і перакампанаваны змест, арыентацыя на кампетэнтнасны падыход у навучанні, значнае ўзмацненне ролі і часткі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій.

Курс “Практыкум па беларускай мове” выконвае спецыфічную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. З аднаго боку, ён сістэматызуе і паглыбляе веды, набытыя ў агульнаадукацыйнай школе, а з другога, рыхтуе першакурснікаў да ўспрымання цыклу лінгвістычных дысцыплін, у першую чаргу, модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова”. Гэтым вызначаюцца мэты і задачы курса.

**Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:**

– удасканаліць філалагічнае мысленне студэнтаў;

– павысіць пісьменнасць студэнтаў, культуру іх мовы;

– развіць маўленчыя ўменні і навыкі;

– выхаваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай годнасці.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– сістэматызаваць і паглыбіць веды, атрыманыя ў агульнаадукацыйнай школе;

– падрыхтаваць да ўспрымання цыкла лінгвістычных дысцыплін і найперш да курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”;

– навучыць абагульняць моўныя факты і з’явы;

– удасканаліць навыкі аналізу слова, словазлучэння і сказа;

– пазнаёміць з найбольш складанымі пытаннямі беларускага правапісу і пунктуацыі;

– развіваць маўленне студэнтаў;

– практыкаваць складанне картатэкі моўных фактаў з твораў беларускіх пісьменнікаў – прызнаных майстроў слова;

– навучыць афармляць асноўныя афіцыйна-справавыя паперы: заяву, даверанасць, аўтабіяграфію, пратакол, распіску і інш.;

– выпрацаваць устойлівыя навыкі і ўменні арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін*

Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, “Практыкум па беларускай мове” займае адно з найважнейшых месцаў у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў і выконвае спецыфічную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. З аднаго боку, ён сістэматызуе і паглыбляе веды, набытыя ў

агульнаадукацыйнай школе, а з другога, рыхтуе першакурснікаў да ўспрымання цыклу лінгвістычных дысцыплін, у першую чаргу, модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі*

Вучэбная дысцыпліна “Практыкум па беларускай мове” звязана з вучэбнымі дысцыплінамі “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Беларуская дыялекталогія” і модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– сістэму лексічных, фанетычных і граматычных асаблівасцей беларускай літаратурнай мовы;

– спецыфічныя рысы беларускай літаратурнай мовы;

– нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– правілы арфаграфіі і пунктуацыі;

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– прытрымліваецца нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўны матэрыял;

– праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– складаць (па зададзеных параметрах) і аналізаваць тэкст (вызначаць тэму, асноўную думку, тып і стыль тэксту, яго структурныя і моўныя асаблівасці);

– заўважаць, кваліфікаваць і выпраўляць памылкі;

– карыстацца лінгвістычнымі і энцыклапедычнымі слоўнікамі;

– складаць картатэку моўных фактаў;

– афармляць афіцыйна-справавыя паперы;

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– нормамі сучаснай беларускай мовы;

– асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах;

– навыкамі лінгвістычнага разбору моўных адзінак на ўсіх узроўнях моўнай сістэмыэ.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Практыкум па беларускай мове” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў базавай прафесійнай кампетэнцыі БПК-12: Выкарыстоўваць моўную сістэму ў сінхраніі, заканамернасці і правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні на практыцы.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне “Практыкум па беларускай мове” студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

**Структура зместу вучэбнай дысцыпліны**

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу курса пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы). Па кожнай

вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

На 1 курсе дзённай формы атрымання адукацыі на вывучэнне дысцыпліны “Практыкум па беларускай мове” адводзіцца 108 вучэбных гадзін, з якіх 50 – аўдыторныя (усе заняткі практычныя), а 58 гадзін адводзіцца на самастойную працу студэнтаў.

Форма адукацыі – дзённая. Форма атэстацыі – экзамен.

***Размеркаванне гадзін у 1 семестры:***

| семестр | усяго гадзін | аўдытор-ныя | прак-тычныя | самаст. работа | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 108 | 50 | 50 | 58 | экзамен |

Раздзелы (тэмы), па якіх праводзяцца рэйтынгавыя кантрольныя работы: тэмы 4.1. – 4.8. (“Арфагарфія”) – рэйтынгавая кантрольная работа № 1; тэмы 7.1. – 7.5. (“Пунктуацыя”) – рэйтынгавая кантрольная работа № 2.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## 1. УВОДЗІНЫ

**1.1 Змест і задачы курса “Практыкум па беларускай мове”, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін. Нарматыўнасць літаратурнай мовы. Кадыфікацыя.**

Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.

Літаратурная норма (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, марфалагічныя, арфаграфічныя, сінтаксічныя нормы). Адхіленні ад літаратурных нормаў і іх прычыны. Захаванне і пашырэнне нормаў літаратурнай мовы.

## 2. СЛОВА, ФРАЗЕАЛАГІЗМ

**2.1 Слова, яго роля ў моўных зносінах.**

Асноўныя правілы слова- і фразеўжывання. Прамое і пераноснае значэнні слоў.

Сінонімы, іх функцыя ў мове.

**2.2 Фразеалагічныя адзінкі.**

Фразеалагізмы, іх значэнне. Ужыванне фразеалагізмаў у мове.

## 3. ФАНЕТЫКА, АРФАЭПІЯ

**3.1 Гукі і літары беларускай мовы**

Галосныя гукі і літары. Зычныя гукі і літары. Некаторыя правілы вымаўлення галосных і зычных (аканне і яканне, вымаўленне *і, ы, й*, дзеканне і цеканне, вымаўленне глухі і звонкіх зычных, падоўжаных зычных, некаторых спалучэнняў зычных).

Склад і націск.

**3.2 Фанетычны аналіз слова**.

## 4. АРФАГРАФІЯ

**4.1 Правілы напісання галосных**

Правапіс літар *о, э, а*. Перадача акання на пісьме. Правапіс слоў са спалучэннямі *ро, ло,* якія чаргуюцца з *ры, лы*. Перадача на пісьме [э] ў запазычаных словах у ненаціскных складах. Ненаціскныя фіналі -*аль, -ар* у запазычаных словах. Ненаціскныя фіналі -*аль, -ар* ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання.

Правапіс літар *е, ё, я*. Перадача якання на пісьме.

Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах.

Правапіс прыстаўных галосных *і, а*.

Правапіс галосных *і, ы, й* пасля прыставак.

Правапіс *у*-*ў.*

Правапіс галосных у складаных і складанаскарочаных словах. Правапіс складаных слоў, якія маюць у сваім складзе больш за дзве часткі.

**4.2 Правілы напісання зычных**

Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных.

Правапіс *д-дз, т-ц.*

Правапіс спалучэнняў зычных.

Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных.

Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных.

**4.3 Правапіс мяккага знака і апострафа**

Правапіс змякчальнага мяккага знака.

Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.

**4.4 Правапіс прыставак**

Правапіс зычных у прыстаўках. Правапіс прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, раз- (рас-), с- (з-), уз- (ус-), із-, без-, небез-, абез-, праз-, цераз-*. Правапіс зычных на стыку прыстаўкі і кораня. Перадача на пісьме спалучэнняў літар *сч, сш, сшч, зж*, здж на стыку прыстаўкі і кораня.

Правапіс прыставак *су-, са-, дэз-, дыс-, суб-*. Правапіс прэфіксоідаў *(звыш-, між-, пан-, супер-, транс-, контр-, экс-).*

**4.5 Правапіс суфіксаў**

Правапіс некаторых суфіксаў назоўнікаў (*-ец-/-ац-, -іц-/-ыц-, -ак-/-ек-, -ык-/-ік-, -ань-/-ень-, -чык-/чыц-, -шчык-/-шчыц-, -чын-/-шчын-, -ств-*).

Правапіс суфіксаў прыметнікаў (*-еньк-/-аньк-/-эньк; -н-/-энн-/-енн-; -ан-/-ян-, - ск-*).

Правапіс суфіксаў дзеясловаў (*-ава-/-ява-/-ва-; -ыва-/-іва-*). Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў (*-н-, -ен-, -ан-*).

Правапіс зычных на стыку марфем.

**4.6 Правапіс слоў разам, асобна, праз злучок**

Правапіс складанаскарочаных слоў і вытворных ад іх.

Правапіс складаных слоў і вытворных ад іх з пачатковымі іншамоўнымі часткамі *авія-, агра-, астра-, аўдыя-, аўта-, аэра-, бія-, варыя-, вела-, відэа-, гама-, геа-, грам-, заа-, кіна-, макра-, медыя-, мота-, неа-, палеа-, радыё-, сацыя-, спарт-, стэрэа-, танц-, тэле-, фота-, электра-* і інш.

Правапіс слоў з пачатковай часткай *поў- (паў-).*

Правапіс слоў з прыстаўкамі і падобнымі да прыставак пачатковымі часткамі: *а-, анты-, арта-, архі-, гіпер-, дыс-, дэз-, звыш-, інтэр-, інфра-, квазі-, контр-, мета-, між-, мілі-, пан-, паст-, псеўда-, сін-, супер-, транс-, ультра-, экс-, экстра-* і інш.

Правапіс складаных слоў, першай часткай якіх з’яўляюцца лічэбнікі.

Правапіс складаных назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў.

Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў слоў.

Правапіс складаных прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Правапіс выклічнікаў.

**4.7 Правапіс часціц *не (ня)* і *ні* з рознымі часцінамі мовы**

Правапіс часціц *не (ня)* і *ні* з назоўнікамі, прыметнікамі, займеннікамі, дзеясловамі, дзеепрыметнікамі і дзеепрыслоўямі.

**4.8 Ужыванне і правапіс вялікай і малой літар**

Ужыванне вялікай літары ў залежнасці ад месца слова ў тэксце.

Ужыванне вялікай літары ва ўласных імёнах (уласныя імёны асоб, мянушкі жывёл, геаграфічныя назвы, астранамічныя назвы, назвы гістарычных эпох і падзей, геалагічных перыядаў, назвы свят, знамянальных дат, назвы ўзнагарод, назвы літаратурных, музычных твораў, карцін, кінафільмаў, друкаваных выданняў, назвы ўстаноў, арганізацый, прадпрыемств, аб'яднанняў).

Правапіс вялікай літары ў прыметніках, утвораных ад уласных імёнаў.

Вялікая літара ў складанаскарочаных словах.

## 5. МАРФАЛОГІЯ

### 5.1 Назоўнік

Правапіс канчаткаў назоўнікаў першага скланення. Правапіс канчаткаў назоўнікаў другога скланення. Правапіс канчаткаў назоўнікаў трэцяга скланення. Правапіс канчаткаў назоўнікаў рознаскланяльных назоўнікаў мужчынскага роду на *-а(-я).*

### 5.2 Прыметнік

Ступені параўнання якасных прыметнікаў.

### 5.3 Лічэбнік

Ужыванне лічэбнікаў з назоўнікамі.

### 5.4 Дзеяслоў і яго формы

Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у беларускай мове.

## 6. СІНТАКСІС

### 6.1 Словазлучэнне

Асаблівасці дзеяслоўнага кіравання щ беларускай мове.

### 6.2 Просты сказ

Некаторыя выпадкі каардынацыі дзейніка і выказніка.

## 7. ПУНКТУАЦЫЯ

### 7.1 Знакі прыпынку ў канцы сказа.

Правілы пастаноўкі кропкі. Правілы пастаноўкі пытальніка. Правілы пастаноўкі клічніка.

### 7.2 Працяжнік у простым сказе

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Інтанацыйны працяжнік. Працяжнік у няпоўным сказе.

### 7.3 Знакі прыпынку ў простым ускладненым сказе

Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку ў сказах з абагульняльным словам.

Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі даданымі членамі.

Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах, зваротках, пабочных і ўстаўных канструкцыях.

Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іншых слоў у сказе.

Коска пры выклічніках і гукаперайманнях.

Коска пры сцвярджальных, адмоўных і пытальных словах.

**7.4 Знакі прыпынку ў складаных сказах**

Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах.

Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі.

Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з аднатыпнымі часткамі. Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з разнатыпнымі часткамі.

Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

**7.5 Знакі прыпынку пры цытатах і простай мове**

Простая мова і знакі прыпынку пры ёй. Знакі прыпынку ў сказах зускоснай мовай. Правілы афармлення няўласна-простай мовы. Цытаты і правілы іх афармлення.

## 8. АФІЦЫЙНЫЯ ПАПЕРЫ

**8.1 Віды афіцыйных папер і агульныя патрабаванні да іх.**

Уніфікацыя і стандартызацыя службовых папер. Афармленне і напісанне заявы, распіскі, акта, даверанасці, аўтабіяграфіі, пратакола і інш. Рэгламентацыя лексічных і сінтаксічных сродкаў афіцыйнага стылю.

## Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Коль-касць аўды-торных гадзін | Самастойная праца | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Практычныя | | | |
| **ПРАКТЫКУМ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ** | | **50** | **58** | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **2** | | | |
| 1.1 | **Змест і задачы курса “Практыкум па беларускай мове”, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін. Нарматыўнасць літаратурнай мовы. Кадыфікацыя.**<br>Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.<br>Літаратурная норма (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, марфалагічныя, арфаграфічныя, сінтаксічныя нормы). Адхіленні ад літаратурных нормаў і іх прычыны. Захаванне і пашырэнне нормаў літаратурнай мовы. | 2 | | 1, 2, 2д | Франтальнае апытванне. |
| **2.** | **Слова. Фразеалагізм** | **4** | **4** | | |
| 2.1 | **Слова, яго роля ў моўных зносінах.**<br>Асноўныя правілы слова- і фразеўжывання. Прамое і пераноснае значэнні слоў.<br>Сінонімы, іх функцыя ў мове. | 2 | 2 | 1, 2, 2д, 3д | Індывіуальнае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2.2 | **Фразеалагічныя адзінкі.**<br>Фразеалагізмы, іх значэнне.<br>Ужыванне фразеалагізмаў у мове. | 2 | 2 | 2д, 3д | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| **3.** | **Фанетыка, арфаэпія** | **4** | **2** | | |
| 3.1 | **Гукі і літары беларускай мовы.**<br>Галосныя гукі і літары. Галосныя гукі і літары. Зычныя гукі і літары. Некаторыя правілы вымаўлення галосных і зычных (аканне і яканне, вымаўленне *і, ы, й*, дзеканне і цеканне, вымаўленне глухі і звонкіх зычных, падоўжаных зычных, некаторых спалучэнняў зычных). | 2 | 2 | 2д | Праверка выкананых парктыкаванняў. Індывідуальнае апытванне. |
| | Склад і націск | 1 | | 2д | Індывідуальнае апытванне. |
| **3.2** | **Фанетычны аналіз слова.** | 1 | | 2д | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| **4.** | **Арфаграфія** | **16** | **20** | | |
| 4.1 | **Правілы напісання галосных.**<br>Правапіс літар *о, э, а*. Перадача акання на пісьме. Правапіс слоў са спалучэннямі *ро, ло,* якія чаргуюцца з *ры, лы*. Перадача на пісьме [э] ў запазычаных словах у ненаціскных складах. Ненаціскныя фіналі -*аль,* -*ар* у запазычаных словах. Ненаціскныя фіналі -*аль,* -*ар* ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання.<br>Правапіс літар *е, ё, я*. Перадача якання на пісьме.<br>Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах.<br>Правапіс прыстаўных галосных *і, а*.<br>Правапіс галосных *і, ы, й* пасля прыставак.<br>Правапіс *у-ў*.<br>Правапіс галосных у складаных і складанаскарочаных словах. Правапіс складаных слоў, якія маюць у сваім складзе больш за дзве часткі. | 2 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Ушчыльненае апытванне.<br>Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў |
| 4.2 | **Правілы напісання зычных.**<br>Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных.<br>Правапіс *д-дз, т-ц*.<br>Правапіс спалучэнняў зычных.<br>Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных.<br>Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных. | 1 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Індывідуальнае апытванне.<br>Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4.3 | **Правапіс мяккага знака і апострафа.**<br>Правапіс змякчальнага мяккага знака.<br>Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа. | 1 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Франтальнае апытванне.<br>Слоўнікавы дыктант. |
| 4.4 | **Правапіс прыставак.**<br>Правапіс зычных у прыстаўках. Правапіс прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, раз- (рас-), с- (з-), уз- (ус-), із-, без-, небез-, абез-, праз-, цераз-*. Правапіс зычных на стыку прыстаўкі і кораня. Перадача на пісьме спалучэнняў літар *сч, сш, сшч, зж*, здж на стыку прыстаўкі і кораня.<br>Правапіс прыставак *су-, са-, дэз-, дыс-, суб-*. Правапіс прэфіксоідаў *(звыш-, між-, пан-, супер-, транс-, контр-, экс-)*. | 1 | <br><br><br>2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| 4.5 | **Правапіс суфіксаў.**<br>Правапіс некаторых суфіксаў назоўнікаў *(-ец-/-ац-, -іц-/-ыц-, -ак-/-ек-, -ык-/-ік-, -ань-/-ень-, -чык-/чыц-, -шчык-/-шчыц-, -чын-/-шчын-, -ств-*).<br>Правапіс суфіксаў прыметнікаў *(-еньк-/-аньк-/-эньк; -н-/-энн-/-енн-; -ан-/-ян-, - ск-*).<br>Правапіс суфіксаў дзеясловаў *(-ава-/-ява-/-ва-; -ыва-/-іва-*). Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў (*-н-, -ен-, -ан-*).<br>Правапіс зычных на стыку марфем. | 1 | <br><br><br><br>2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| 4.6 | **Правапіс слоў разам, асобна, праз злучок.**<br>Правапіс складанаскарочаных слоў і вытворных ад іх.<br>Правапіс складаных слоў і вытворных ад іх з пачатковымі іншамоўнымі часткамі *авія-, агра-, астра-, аўдыя-, аўта-, аэра-, бія-, варыя-, вела-, відэа-, гама-, геа-, грам-, заа-, кіна-, макра-, медыя-, мота-, неа-, палеа-, радыё-, сацыя-, спарт-, стэрэа-, танц-, тэле-, фота-, электра-* і інш.<br>Правапіс слоў з пачатковай часткай *поў- (паў-)*.<br>Правапіс слоў з прыстаўкамі і падобнымі да прыставак пачатковымі часткамі: *а-, анты-, арта-, архі-, гіпер-, дыс-, дэз-, звыш-, інтэр-, інфра-, квазі-, контр-, мета-, між-, мілі-, пан-, паст-, псеўда-, сін-, супер-, транс-, ультра-, экс-, экстра-* і інш. | 2 | <br><br><br><br><br><br><br><br>2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Індывідуальнае апытванне.<br>Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | Правапіс складаных слоў, першай часткай якіх з’яўляюцца лічэбнікі.<br>Правапіс складаных назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў. | 2 | <br>2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Франтальнае апытванне<br>Слоўнікавы дыктант. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў слоў.<br>Правапіс складаных прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Правапіс выклічнікаў. | 2 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 4.7 | **Правапіс часціц *не (ня)* і *ні* з рознымі часцінамі мовы.**<br>Правапіс часціц *не (ня)* і *ні* з назоўнікамі, прыметнікамі, займеннікамі, дзеясловамі, дзеепрыметнікамі і дзеепрыслоўямі. | 2 | | 1, 2,<br>1д, 2д | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| 4.8 | **Ужыванне і правапіс вялікай і малой літар.**<br>Ужыванне вялікай літары ў залежнасці ад месца слова ў тэксце.<br>Ужыванне вялікай літары ва ўласных імёнах (уласныя імёны асоб, мянушкі жывёл, геаграфічныя назвы, астранамічныя назвы, назвы гістарычных эпох і падзей, геалагічных перыядаў, назвы свят, знамянальных дат, назвы ўзнагарод, назвы літаратурных, музычных твораў, карцін, кінафільмаў, друкаваных выданняў, назвы ўстаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, аб'яднанняў).<br>Правапіс вялікай літары ў прыметніках, утвораных ад уласных імёнаў.<br>Вялікая літара ў складанаскарочаных словах.<br>Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэме “Арфаграфія”. | 2 | 2<br>2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 па тэмах 4.1 – 4.8. |
| **5.** | **Марфалогія** | **6** | **12** | | |
| 5.1 | **Назоўнік.**<br>Правапіс канчаткаў назоўнікаў першага скланення.<br>Правапіс канчаткаў назоўнікаў другога скланення.<br>Правапіс канчаткаў назоўнікаў трэцяга скланення.<br>Правапіс канчаткаў назоўнікаў рознаскланяльных назоўнікаў мужчынскага роду на *-а(-я).* | 2 | 2<br>2<br>2 | 1, 2,<br>1д, 2д,<br>3д | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 5.2 | **Прыметнік.**<br>Ступені параўнання якасных прыметнікаў. | 1 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д,<br>3д | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| 5.3 | **Лічэбнік.**<br>Ужыванне лічэбнікаў з назоўнікамі. | 1 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д,<br>3д | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 5.4. | **Дзеяслоў і яго формы.**<br>Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у беларускай | 2 | 2 | 2д, 3д | Ушчыльненае апытванне. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | мове. | | | | |
| **6.** | **Сінтаксіс** | **2** | **2** | | |
| 6.1 | **Словазлучэнне.**<br>Асаблівасці дзеяслоўнага кіравання ў беларускай мове. | 1 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 6.2 | **Просты сказ.**<br>Некаторыя выпадкі каардынацыі дзейніка і выказніка. | 1 | | 1, 2, 1д, 2д | Праверка выкананых заданняў. |
| **7.** | **Пунктуацыя** | **14** | **16** | | |
| 7.1 | **Знакі прыпынку ў канцы сказа.**<br>Правілы пастаноўкі кропкі.<br>Правілы пастаноўкі пытальніка.<br>Правілы пастаноўкі клічніка. | 1 | | 1, 2, 1д, 2д | Франатальнае апытванне. Праверка выкананых заданняў. |
| 7.2 | **7.2 Працяжнік у простым сказе**<br>Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.<br>Інтанацыйны працяжнік.<br>Працяжнік у няпоўным сказе. | 1 | | 1, 2, 1д, 2д | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| 7.3 | **Знакі прыпынку ў простым ускладненым сказе.**<br>Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку ў сказах з абагульняльным словам.<br>Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі даданымі членамі. | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д | Індывідуальнае апытванне . Праверка картатэкі моўных фактаў. |
| | Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах, зваротках, пабочных і ўстаўных канструкцыях.<br>Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іншых слоў у сказе.<br>Коска пры выклічніках і гукапераймannях.<br>Коска пры сцвярджальных, адмоўных і пытальных словах. | 2 | 2<br>2 | 1, 2, 1д, 2д | Індывідуальнае апытванне . Праверка картатэкі моўных фактаў. |
| 7.4 | **Знакі прыпынку ў складаных сказах.**<br>Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах. | 1 | 2 | 1, 2, 1д, 2д | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| | Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах.<br>Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі. | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д | Праверка выкананых практыкаванняў. Ушчыльненае апытванне. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з аднатыпнымі часткамі.<br>Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з разнатыпнымі часткамі. | 1 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Франтальнае аптыванне.<br>Праверка выкананых праткыкаванняў. |
| | Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі. | 2 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д | |
| 7.5 | **Знакі прыпынку пры цытатах і простай мове.**<br>Простая мова і знакі прыпынку пры ёй. Знакі прыпынку ў сказах з ускоснай мовай. Правілы афармлення няўласна-простай мовы.<br>Цытаты і правілы іх афармлення.<br>Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэме “Пунктуацыя”. | 2 | 2 | 1, 2,<br>1д, 2д | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 па тэмах 7.1 – 7.5**.** |
| **8.** | **Афіцыйныя паперы** | **2** | **2** | | |
| 8.1 | **Віды афіцыйных папер і агульныя патрабаванні да іх.**<br>Уніфікацыя і стандартызацыя службовых папер.<br>Афармленне і напісанне заявы, распіскі, акта, даверанасці, аўтабіяграфіі, пратакола і інш.<br>Рэгламентацыя лексічных і сінтаксічных сродкаў афіцыйнага стылю. | 2 | 2 | 2д | Праверка афармлення афіцыйных папер. |
| | ***Усяго гадзін у 1 семестры: 108 г.*** | ***50*** | ***58*** | | ***Экзамен*** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Беларускі правапіс [Электронны рэсурс] : дапаможнік / І. Л. Бурак [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/31598. – Дата доступу: 04.05.2023.
2. Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс / склад.: А. С. Васілеўская, Т. С. Бабровіч // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/44191. – Дата доступу: 03.05.2023.

**Дадатковая літаратура**

1. Куліковіч, У. І. Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі : вучэб. дапам. / У. І. Куліковіч. – Мінск : Новое знание, 2011. – 507 с.
2. Лепешаў, І. Я. Практыкум па беларускай мове : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / І. Я. Лепешаў, Г. М. Малажай, К. М. Панюціч. – 2-е выд., папраўл. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 332 с.
3. Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2017. – Т. 7 : Беларуская мова. – 495 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з’яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодваць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з’яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на дадзеную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб’ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзеннясамастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных работ;

– выкананне кантрольных работ, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых работ;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняўдля самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плана тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі;

–азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю);

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;

– калёквіумы;

– канферэнцыі;

– залікі па тэмах / раздзелах;

– тэсціраванне;

– кантрольныя работы;

– вусны і пісьмовы экзамены.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойнай працы, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з’яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная праца студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай працы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні задання. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г. з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выка-нання |
|---|---|---|---|---|
| 2.1. | Сінонімы, іх функцыі ў мове. | 2 | Выпісаць са “Слоўніка сінонімаў і блізказначных слоў” / М. К. Клышка (Мінск, 2005) сінонімы да слоў ***вітацца, імгла, лёс, далёка, спяшацца, сумны, гаваркі.*** Вызначыць у гэтых сінанімічных радах дамінанту. Скласці і запісаць з кожным словам сінанаімічнага рада сказ. | Праца са слоўнікам, практыка-ванне |
| 2.2. | Ужыванне фразеалагізмаў у мове. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў сказы з фразеалагізмамі, патлумачыць значэнне фразем. | Картатэка моўных фактаў, практыка-ванне |
| 3.1 | Некаторыя правілы вымаўлення галосных і зычных (аканне і яканне, вымаўленне *і, ы, й*, дзеканне і цеканне, вымаўленне глухі і звонкіх зычных, падоўжаных зычных, некаторых спалучэнняў зычных) | 2 | Заканспектаваць раздзелы з кнігі “Беларускае літаратурнае вымаўленне” / Ф. М. Янкоўскі (Мінск, 1976) пра асаблівасці вымаўлення зычных гукаў і спалучэнняў зычных гукаў у беларускай мове. | Канспект |
| 4.1. | Ненаціскныя фіналі -*аль, -ар* у запазычаных словах. Ненаціскныя фіналі -*аль, -ар* ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання. | 2 | Падабраць прыклады на правапіс фаналяў -*аль, -ар* у запазычаных словах. | Картатэка моўных фактаў |
| 4.2. | Правапіс спалучэнняў зычных. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю па правапісе спалучэнняў зычных. | Прэзентацыя |
| 4.3. | Правапіс мяккага знака і апострафа. Правапіс змякчальнага мяккага знака. Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 93 // “Практыкум па беларускай мове” (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 4.4. | Правапіс зычных на стыку прыстаўкі і кораня. Перадача на пісьме спалучэнняў літар *сч, сш, сшч, зж*, здж на стыку прыстаўкі і кораня. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 88 // “Практыкум па беларускай мове” (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 4.5. | Правапіс суфіксаў прыметнікаў *(-еньк-/-аньк-/-эньк; -н-/-энн-/-енн-; -ан-/-* | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 183 // “Практыкум па беларускай мове” (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | *ян-, - ск-*). | | | |
| 4.6. | Правапіс слоў з прыстаўкамі і падобнымі да прыставак пачатковымі часткамі: *а-, анты-, арта-, архі-, гіпер-, дыс-, дэз-, звыш-, інтэр-, інфра-, квазі-, контр-, мета-, між-, мілі-, пан-, паст-, псеўда-, сін-, супер-, транс-, ультра-, экс-, экстра-* і інш | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю па правапісе слоў з прыстаўкамі і падобнымі да прыставак пачатковымі часткамі. | Прэзента-цыя. |
| 4.6. | Правапіс складаных назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 168 і № 187 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 4.6. | Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў слоў. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 240 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 4.8. | Ужыванне і правапіс вялікай і малой літар | 4 | Знайсці ілюстрацыі правапісу вялікай літары ў СМІ. | Картатэка моўных фактаў |
| 5.1. | Правапіс канчаткаў назоўнікаў першага скланення. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 149 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 5.1. | Правапіс канчаткаў назоўнікаў другога скланення. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 152 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 5.1. | Правапіс канчаткаў назоўнікаў рознаскланяльных назоўнікаў мужчынскага роду на *-а(-я).* | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 160 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 5.2. | Ступені параўнання якасных прыметнікаў. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю "Утварэнне ступеняў параўнання якасных прыметнікаў". | Прэзен-тацыя |
| 5.3. | Ужыванне лічэбнікаў з назоўнікамі. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 40 "Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі" // "Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам." (Мінск, 1997). | Канспект |
| 5.4. | Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у беларускай мове. | 2 | Выканаць практыкаванне № 489 і № 497 // "Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі" (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 6.1. | Асаблівасці дзеяслоўнага кіравання ў беларускай мове. | 2 | Пабудаваць словазлучэнні з кіраваннем, выкарыстоўваючы табліцу "Спецыфіка кіравання ў беларускай мове ў параўнанні з рускай" // Рамза, Т. Р. Сінтаксіс: тэарэтычны курс : вучэб. дапам. / Т. Р. Рамза. – Мінск : БДУ, 2006. – С. 40–42. | Практыка-ванне |
| 7.3. | Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі даданымі | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 297 // "Практыкум па беларускай мове" | Прыктыка-ванне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | членамі. | | (Мінск, 2005) | |
| 7.3. | Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах, зваротках, пабочных і ўстаўных канструкцыях. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 302 і № 304// "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 7.3. | Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іншых слоў у сказе. | 2 | З тэкстаў мастацкай літаратуры выпісаць 10 сказаў. | Картатэка моўных фактаў |
| 7.4. | Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 297 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 7.4. | Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 324 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 7.4. | Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з аднатыпнымі часткамі. Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з разнатыпнымі часткамі. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 329 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 7.4. | Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 332 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 7.5. | Простая мова і знакі прыпынку пры ёй. Знакі прыпынку ў сказах з ускоснай мовай. Правілы афармлення няўласна-простай мовы. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 335 // "Практыкум па беларускай мове" (Мінск, 2005) | Практыка-ванне |
| 8.1. | Віды афіцыйных папер і агульныя патрабаванні да іх. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю "Віды афіцыйных папер. Патрабаванні да іх афармлення" | Прэзента-цыя |

# ЗАДАННІ ДА РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

## Рэйтынгавая кантрольная работа № 1

*Тэма 4.1. – 4.8.*
*Заданне:*
*1. Выканайце тэставыя заданні.*

### Варыянт 1

***1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара** а*:
1) адажы…;
2) др…мучы;
3) Ч…люскін;
4) Токі…;
5) ц…нзура.

***2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара** ы*:
1) бр…зент;
2) ж…тон;
3) ц…нзура;
4) канц…лярыя;
5) поч…рк.

***3. Адзначце словы, напісаныя правільна*:**
1) сэрвіс;
2) інтэрнет;
3) радэа;
4) камп'ютэр;
5) Пітэр.

***4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара** е*:
1) Г…расім;
2) л…снікі;
3) высв…тліць;
4) вас…мнаццаць;
5) к…фір.

***5. Адзначце словы, напісаныя правільна*:**
1) землятрасенне;
2) жыццерадасны;
3) Вялікабрытанія;
4) велікадушны;
5) мёдагонка.

***6. Адзначце словы, напісаныя правільна*:**
1) езуіт;
2) Нью-Ёрк;
3) секвойя;
4) пляяда;
5) дыяпазон.

***7. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.***
1) акіянарыум;
2) іанізацыя;
3) ёгурт;
4) іярогліф;
5) кліентура.

***8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара** э*:
1) р…жым;
2) вет…ран;
3) ш…дэўр;
4) т…кстыль;
5) р…сорны.

***9. Адзначце словы, напісаныя правільна*:**
1) вагзал;
4) экзаменатар;

2) вэб-сайт;
3) маладзьба;
5) баскетбол.

***10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара т*:**

1) счарс...велы;
2) у Лі...ве;
3) ча...вёрты;
4) аб таварыс...ве;
5) у кля...ве.

***11. Адзначце словы, напісаныя правільна*:**

1) абласны;
2) фарпостны;
3) карыстлівы;
4) шчаслівы;
5) Рэмбрант.

***12. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца у*:**

1) па...метра;
2) фра...;
3) а...каць;
4) рады...с;
5) ска...т.

***13. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску адбываецца падаўжэнне зычных*:**

1) ка...екцыя;
2) сава...а;
3) Маро...а;
4) кало...е;
5) лама...а.

***14. Адзначце словы, напісаныя няправільна*:**

1) дона;
2) Усціньня;
3) саміт;
4) Ільінскі;
5) Жана.

***15. Адзначце, якую функцыю выконвае апостраф у беларускай мове*:**

1) дапамагае раздзельна вымаўляць прыстаўкі, што заканчваюцца на зычную, і кораня, што пачынаецца з галосных *е, ё, ю, я* або націскной галоснай і;
2) дапамагае злітна вымаўляць шыпячыя *ж, дж, ч, ш* з наступнымі галоснымі *е, ё, ю, я, і*;
3) дапамагае злітна вымаўляць спалучэнні галосных у іншамоўных словах;
4) дапамагае раздзельна вымаўляць губныя б, п, в, ф, м з наступнымі галоснымі *е, ё, ю, я* і націскной *і*;
5) дапамагае размяжоўваць часткі слоў і асобныя словы.

***16. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца раздзяляльны мяккі знак*:**

1) шампін...ён;
2) п...яўка;
3) мыш...;
4) Н...ю-Ёрк;
5) ледз...ве.

***17. Адзначце словы, напісаныя правільна*:**

1) штосьці;
2) нянчыць;
3) Дзьмітрый;
4) ралля;
5) астраханскі.

***18. Адзначце словы, у беларускамоўных адпаведніках якіх пішацца ь*:**

1) букварь;
2) поздний;
3) батальон;
4) четырьмя;
5) миллиард.

***19. Адзначце памылковыя сцвярджэнні*:**
1) мяккі знак пішацца пасля шыпячых *ж, дж, ч, ш*;
2) мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных у дзеясловах загаднага ладу перад канчаткам першай асобы множнага ліку -*ма*;
3) мяккі знак не пішацца для абазначэння на пісьме мяккасці л перад зычнымі;
4) мяккі знак пішацца пасля *з, л, н, с, ц* (з мяккага *т*), *дз* (з мяккага *д*) для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад цвёрдым зычным;
5) мяккі знак пішацца ў некаторых складаных лічэбніках.

***20. Адзначце формы іменных часцін мовы, у якіх на месцы пропуску пішацца змякчальны мяккі знак*:**
1) людз…мі;
2) вясел…ле;
3) стан…ма;
4) камен…чыкі;
5) малюпасен…кага.

***21. Адзначце словы, у якіх на месцы пропускаў пішацца*** *с*:
1) небя...грэшны;
2) абе...галосець;
3) абя...грошыць;
4) пра...мерны;
5) ра...кідаць.

***22. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара*** *з*:
1) ды…прапорцыя;
2) ды…кваліфікаваць;
3) ды…функцыя;
4) ды…крэдытаваць;
5) ды…'юнкцыя.

***23. Адзначце, якія дзеясловы могуць выкарыстоўвацца з суфіксамі -ірава-(-ырава-) і -ава-(-ява-):***
1) кансервіраваць;
2) зандзіраваць;
3) матывіраваць;
4) нарміраваць;
5) канваіраваць.

***24. Адзначце, пры змяненні якіх слоў адбываецца выпадзенне галоснай у суфіксе:***
1) абаронец;
2) макрыца;
3) абхазец;
4) канькабежац;
5) цукарніца.

***25. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца з суфіксам*** *-нн-:*
1) палымя...ы;
2) хвілі...ы;
3) этало...ы;
4) асі...ы;
5) паланё...ы.

***26. Адзначце, у якіх спалучэннях трэба пісаць вялікую літару:***
1) (П,п)алескае золата;
2) (С,с)карынавы кнігі;
3) (З,з)осіна люстэрка;
4) (Б,б)рылёвы мініяцюры;
5) (С,с)карынаўская стыпендыя.

***27. Адзначце словы і спалучэнні слоў, у якіх трэба пісаць малую літару*:**
1) (Б,б)ожы дар;
2) (Б,б)ожая Маці;
3) дай (Б,б)ожа;
4) не давядзі (Г,г)оспадзі;
5) (А,а)лах з вамі.

***28. Адзначце выпадкі няправільнага выкарыстання вялікай літары*:**

1) Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусь;
2) Ерапейскі саюз;
3) Сусветны Паштовы Саюз;
4) Дом адпачынку;
5) Палац спорту.

***29. Адзначце, у якіх найменнях трэба пісаць вялікую літару*:**
1) (Н,н)овы (З,з)апавет;
2) (Г,г)отыка;
3) (Р,р)энесанс;
4) (М,м)адэрн;
5) (К,к)аран.

***30. Адзначце выпадкі няправільнага выкарыстання малой літары*:**
1) свята рамадан;
2) дзень Рэспублікі;
3) Першая сусветная вайна;
4) высакосны год;
5) зімовыя каляды.

***31. Адзначце словы, якія пішуцца разам*:**
1) (мала) населены;
2) (рэдка) пасаджаны;
3) (контр) адмірал;
4) (плац) карта;
5) (волат) дуб.

***32. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок*:**
1) (прэм'ер) міністр;
2) (паўночна) заходні;
3) (трох) гадовы;
4) (праца) дзень;
5) (паў) лімона.

***33. Адзначце словы, якія пішуцца разам*:**
1) (стара) беларуская мова;
2) (гары) цвет;
3) (віцэ) чэмпіён;
4) (прырода) апісальная лірыка;
5) (паветра) ачышчальная ўстаноўка.

***34. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок*:**
1) 300 (мільённы);
2) (тры) пятыя;
3) (абы) як;
4) (два) тры кіламетры;
5) (на) чале.

***35. Адзначце словы, якія пішуцца разам*:**
1) упаў (з) верху дрэва;
2) (на) жаль;
3) ісці (на) права;
4) прыйду (пасля) заўтра;
5) (с) пачатку пачні.

***36. Адзначце словы, якія пішуцца асобна*:**
1) (там) сама;
2) (па) бацькоўску;
3) (у) адно;
4) (да) спадобы;
5) (з) боку дарогі.

***37. Адзначце сказы, у якіх не- (ня-) пішацца разам:***
1) За лесам паказалася (не) узаранае поле.
2) Учора (не) дакасіў атаву каля лесу.
3) Дрэвы стаялі (не) варушачыся.
4) Вёска цэлая, (не) кранутая вайной.
5) Яе надзвычай (не) прадуманае рашэнне не спадабалася класу.

***38. Адзначце сказы, у якіх не- (ня-) пішацца асобна*:**

1) На стале ляжала (не) прачытаная кніга.
2) (Не) вылечная хвароба адступіла.
3) Па нікому (не) вядомай прычыне майстэрню закрылі.
4) (Не) чутна ступаючы, кошка выслізнула з пакоя.
5) (Не) гледзячы на сябра, Алесь доўга расказваў пра сваю нялёгкую службу.

***39. Адзначце сказы, у якіх** не- (ня-) **пішацца разам**:*
1) Чалавеку пачало (не) дабрыцца.
2) Бульба (не) дакапана.
3) Туман, (не) разагнаны ветрам, слаўся па зямлі.
4) Вельмі (не) ураджайны год выдаўся ў тую пару.
5) Вёсачка ў адну вуліцу выглядала (не) прыветна.

## Варыянт 2

***1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара а:***
1) скан…р;
2) шніц…ль;
3) бар…ль;
4) камп’ют…р;
5) Юпіт…р.

***2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара э:***
1) рэзюм…;
2) карат…;
3) куп…;
4) філ…;
5) камюнік…

***3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара я:***
1) л…генда;
2) шасцідз…сяты;
3) м…тровы;
4) дз…сятка;
5) сямідз…сяці.

***4. Адзначце рады, у якіх усе словы запісаны правільна:***
1) сялянін, Сяргей, кераміка, беспаваротны, дзявятка, васямнаццаты;
2) фотакамера, вогнеўстойлівы, матавоз, мотагонка, стапрацэнтны, збожжасховішча;
3) холад, Токіа, жамчужына, літэра, тэндар, шынель;
4) вялікасвецкі, белабрысы, мёдаварэнне, часопіс, баездольны, вялікагаловы;
5) сэрвіс, каратэ, сальта-мартале, тунэль, менеджмент, Еўропаю.

***5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара а:***
1) лі…на;
2) і…нізацыя;
3) ды…грама;
4) акардэ…ніст;
5) гені…льны.

***6. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка:***
1) езуіт;
2) Нью-Ёрк;
3) секвойя;
4) пляяда;
5) дыапазон.

***7. Адзначце спалучэнні, дзе не трэба пісаць прыстаўную галосную:***
1) смелае (і)львяняня;
2) пад (і)льдом;
3) (а)ржаны хлеб;
4) па леташнім (і)ржышчы;
5) за(і)ржавелы.

***8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ы:***

1) р…жым;
2) вет…ран;
3) ш…дэўр;
4) т…кстыль;
5) р…сорны.

***9. Адзначце словы, напісаныя правільна:***
1) ятвяг;
2) бацвінне;
3) рэзідэнцыя;
4) уверцюра;
5) пласцік.

***10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца д:***
1) мя...ведзь;
2) мар...він;
3) па...веяць;
4) ...вухтомны;
5) ...ве.

***11. Адзначце словы, напісаныя няправільна*:**
1) кампосны;
2) пырскнуць;
3) пяшчаны;
4) пяшчота;
5) фарштадт.

***12. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца ў*:**
1) но...-ха...;
2) ка…бой;
3) паўднёва-...сходні;
4) Ланда...;
5) а...дыт.

***13. Адзначце словы, напісаныя правільна*:**
1) піцца;
2) манна;
3) Мекка;
4) Улляна;
5) куцця.

***14. Адзначце словы, у якіх адбылося марфалагічнае падваенне зычных:***
1) рассохлы;
2) беззямельны;
3) узбярэжжа;
4) чыгунны;
5) сувяззю.

***15. Адзначце, якую функцыю выконвае апостраф у беларускай мове*:**
1) дапамагае раздзельна вымаўляць прыстаўкі, што заканчваюцца на зычную, і кораня, што пачынаецца з галосных *е, ё, ю, я* або націскной галоснай і;
2) дапамагае злітна вымаўляць шыпячыя *ж, дж, ч, ш* з наступнымі галоснымі *е, ё, ю, я, і*;
3) дапамагае злітна вымаўляць спалучэнні галосных у іншамоўных словах;
4) дапамагае раздзельна вымаўляць губныя *б, п, в, ф, м* з наступнымі галоснымі *е, ё, ю, я* і націскной *і*;
5) дапамагае размяжоўваць часткі слоў і асобныя словы.

***16. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца змякчальны мяккі знак*:**
1) паштал...ён;
2) дз...ве;
3) бур...ян;
4) мен...шы;
5) чэрвен...скі.

***17. Адзначце словы, напісаныя няправільна*:**
1) трох’ярусны;
2) іньекцыя;
3) біл’ярд;
4) раз’юшаны;
5) Дзям’ян.

***18. Адзначце словы, у беларускамоўных адпаведніках якіх пішацца апостраф*:**

1) пьеса; 4) воробьи;
2) льёт; 5) барьер.
3) адъютант;

***19. Адзначце памылковыя сцвярджэнні*:**

1) мяккі знак пішацца ў назоўніках перад суфіксам -*чык*-, калі зыходнае слова не заканчвалася на н';
2) мяккі знак пішацца пры асіміляцыйнай мяккасці;
3) мяккі знак пішацца ў словах меньшы, іньшы;
4) мяккі знак не пішацца паміж падоўжанымі зычнымі;
5) мяккі знак пішацца перад суфіксам -ск- у прыметніках, утвораных ад назваў месцаў, якія заканчваюцца на *н'*.

***20. Адзначце формы дзеясловаў, у якіх на месцы пропуску пішацца змякчальны мяккі знак*:**

1) ляж…ма; 4) сем…сот;
2) хтос…ці; 5) намыл…ся.
3) пасун…це;

***21. Адзначце словы, у якіх на месцы пропускаў пішацца з*:**

1) ра...'езд; 4) абя...шкодзіць;
2) ...хапіць; 5) ра...дум'е.
3) ро...піс;

***22. Адзначце, у якіх выпадках спалучэнні літар сч, сшч, зж, здж на стыку прыстаўкі і кораня перадаюцца нязменна*:**

1) ра…шчодрыцца; 4) з…жаліць;
2) бе…журботна; 5) у…чуванне.
3) ні…чымніца;

***23. Адзначце, якія дзеясловы ў форме незакончанага трывання будуць пісацца з літарай й перад суфіксам -ва-.***

1) завіць; 4) утаіць;
2) заклеіць; 5) завабіць.
3) прасеяць;

***24. Адзначце словы, у якіх пішацца суфікс -цтв-:***

1) шасцідзесятні...а; 4) аматар...а;
2) штукар...а; 5) шляхе...а.
3) эпігон...а;

***25. Адзначце словы, у якіх пішацца суфіксам -шчык-:***

1) ракет...; 4) выбар...;
2) груз...; 5) перапіс...
3) вугаль...;

***26. Адзначце, у якіх спалучэннях трэба пісаць малую літару*:**

1) (А, а)ўгіевы стайні; 4) (Р,р)энтгенаўскі здымак;
2) (Г,г)арэцкія чытанні; 5) (М,м)мележаўскі раман.
3) (М,м)іхасёў сшытак;

***27. Адзначце словы, у якіх трэба пісаць вялікую літару*:**
1) (В,в)ішну;
2) (Х,х)ерувім;
3) (Б,б)уда;
4) (С,с)варог;
5) (М,м)уза.

***28. Адзначце выпадкі правільнага выкарыстання вялікай літары*:**
1) Таварыства Чырвонага Крыжа;
2) Нацыянальны Кангрэс;
3) Палата Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ;
4) Адміністрацыя Прэзідэнта РБ;
5) Сельсавет.

***29. Адзначце, у якіх найменнях трэба пісаць малую літару*:**
1) (Б,б)іблія;
2) (А,а)драджэнне;
3) (А,а)мпір;
4) Свята (П,п)рацы;
5) санітарны (Д,д)зень.

***30. Адзначце выпадкі няправільнага выкарыстання вялікай літары*:**
1) Масленіца;
2) Ордэн Маці;
3) Ракако;
4) Кафедра беларускай мовы;
5) Мінэканомікі.

***31. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок*:**
1) (лаціна) амерыканскі;
2) (метэа) служба;
3) (давыд) гарадоцкі;
4) (плашч) палатка;
5) (сельска) гаспадарчы.

***32. Адзначце словы, якія пішуцца асобна*:**
1) (вярні) дуб;
2) (хутка) прачытаны;
3) (віцэ) прэзідэнт;
4) (нізка) прыбіты;
5) (інда) еўрапейскі.

***33. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок*:**
1) (далёка) усходні;
2) (ваенна) служачы;
3) (мікра) раён;
4) (Нёман) рака;
5) (Заходне) Сібірская нізіна.

***34. Адзначце словы, якія пішуцца разам*:**
1) (дваццаці) тысячны;
2) (пяцьсот) трэці;
3) (дзевяць) сот;
4) (на) конт;
5) (такі) сказаў.

***35. Адзначце словы, якія пішуцца разам*:**
1) ішлі (ў) трох;
2) (на) памяць;
3) (на) што ты сказаў?;
4) недзе (у) баку;
5) ныраць (у) глыб.

***36. Адзначце словы, якія пішуцца разам*:**
1) (пад) вечар;
2) (у) пустую;
3) (абы) дзе;
4) (у) дзень;
5) (па) воўчы.

***37. Адзначце сказы, у якіх не-(ня-) пішацца асобна*:**
1) Ён так і (не) дапісаў свой раман.
2) Кніга тая (не) прачытана.
3) (Не) зважаючы на дождж, людзі працавалі.
4) Для добрых людзей (не) шкада часу.
5) Гэты (не) дахоп можа стаць вялікай бядой.

***38. Адзначце сказы, у якіх не-(ня-) пішацца разам*:**
1) Смутна ў асеннюю (не) пагадзь.
2) Было (не) цёмна, а шаравата.
3) Мы ідзём уздоўж (не) шырокай рэчкі.
4) Зялёная, (не) кранутая марозам трава.
5) Часамі на працы яго (не) даацэньвалі.

***39. Адзначце сказы, у якіх не-(ня-) пішацца асобна*:**
1) (Не) кранутая ежа стаяла на стале.
2) На яшчэ (не) узараным полі стаялі стагі саломы.
3) Рака была (не) глыбокая, а плыткая.
4) У майго сябра справы ідуць (не) лепш.
5) Пасека знаходзілася зусім (не) блізка.

## Рэйтынгавая кантрольная работа № 2

*Тэмы 7.1. – 7.5.*

*Заданні:*
*1. Запішыце тэкст пад дыктоўку.*

Дарога то падымалася на ўзгоркі, то спускалася ў лагчыны, разгортваючы ўсё новыя і новыя малюнкі. Мясцовасць тут мела зусім іншы выгляд і рэзка адрознівалася ад палескай роўнядзі, з якой звыклася вока маладога настаўніка за гады яго побыту на Палессі. Але кароткі зімні дзень быў хмуры. Неба, усцяж засланае бялесымі воблакамі, пазірала непрыветна і холадна і, нізка навісшы над прасторамі зямлі, надавала ім пануры выгляд, накладала пячаць аднастайнай паныласці. Усё гэта пакідала адбітак на настрой настаўніка. Не вабілі вока блізкія і далёкія сялянскія сядзібы, параскіданыя па заснежаных прасторах палёў то хутаркамі, то невялічкімі вёсачкамі. Няветла пазіралі стрэхі будынкаў з цэлымі пластамі снегу, пачарнелыя сцены хат і вокны, выбеленыя зімняю сцюжаю, і гэта сцюжа, здавалася, яшчэ ніжэй прыгінала да зямлі людскія сялібы. Над хатамі сям-там узнімаліся дрэвы. Аголеныя, бязлістыя шатры іх, як шкілеты, яшчэ мацней падкрэслівалі паныласць усяго краявіду. Лабановіч адчуваў у сэрцы журботу аб Палессі, па тых вобразах, што далёка засталіся ззаду. Ён успамінаў Выганаўскую школу, вучняў, знаёмых сялян, з якімі ён здружыўся і з якімі расстаўся так раптоўна і нават трагічна. Шчаслівая акалічнасць памагла яму выблытацца з той непрыемнай справы, якая пагражала астрогам або

высылкаю. Начальства само не ведала, як паставіцца да Лабановіча за напісаную ім петыцыю. І настаўніка пусцілі на волю, прачытаўшы яму адпаведную натацыю, і абмежаваліся пераводам у іншую школу. Вось туды і едзе ён цяпер. Цікава, што гэта за школа і якіх людзей сустрэне ён на новым месцы? (231 слова)

Якуб Колас. "На ростанях".

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦІПЛІНЫ

Для атрымання аб'ектыўнай інфармацыі аб узроўні паспяховасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне "Практыкум па беларускай мове" мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю выкарыстоўваецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

З мэтай выніковай дыягностыкі якасці засваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне "Практыкум па беларускай мове" вучэбным планам прадугледжана правядзенне кантрольных работ living рознага віду. Пры падборы заданняў улічваецца аб'ём тэарэтычных звестак па пэўнай тэме, індывідуальны ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў і інш.

Апераджальная, бягучая і прамежкавая дыягностыка кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне "Практыкум па беларускай мове" можа мець розныя формы, сярод якіх:

•вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на практычных занятках, калёквіумы, вусныя залікі і экзамены;

•пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, дыктанты для самакантролю, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовыя залікі і экзамены;

•графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме);

•тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах рэкамендуецца выкарыстоўваць тэсты і тэставыя заданні, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні. Рэкамендаваная выніковая форма кантролю – экзамен.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ "ПРАКТЫКУМ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ"

1. Змест і задачы курса "Практыкум па беларускай мове", яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін. Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.

2. Нарматыўнасць літаратурнай мовы. Кадыфікацыя. Літаратурная норма (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, марфалагічныя, арфаграфічныя, сінтаксічныя нормы). Адхіленні ад літаратурных нормаў і іх прычыны. Захаванне і пашырэнне нормаў літаратурнай мовы.

3. Асноўныя правілы слова- і фразеўжывання. Прамое і пераноснае значэнні слоў.

4. Сінонімы, іх функцыя ў мове.

5. Фразеалагізмы, іх значэнне. Ужыванне фразеалагізмаў у мове.

6. Галосныя гукі і літары. Некаторыя правілы вымаўлення галосных (аканне і яканне, вымаўленне *і, ы, й*)

7. Зычныя гукі і літары. Некаторыя правілы вымаўлення зычных (дзеканне і цеканне, вымаўленне глухі і звонкіх зычных, падоўжаных зычных, некаторых спалучэнняў зычных).

8. Склад і націск.

9. Фанетычны аналіз слова.

10. Правапіс літар *о, э, а*. Перадача акання на пісьме. Правапіс слоў са спалучэннямі *ро, ло,* якія чаргуюцца з *ры, лы*. Перадача на пісьме [э] ў запазычаных словах у ненаціскных складах. Ненаціскныя фіналі *-аль, -ар* у запазычаных словах. Ненаціскныя фіналі *-аль, -ар* ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання.

11. Правапіс літар *е, ё, я.* Перадача якання на пісьме.

12. Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах.

13. Правапіс прыстаўных галосных *і, а*.

14. Правапіс галосных *і, ы, й* пасля прыставак.

15. Правапіс *у-ў.*

16. Правапіс галосных у складаных і складанаскарочаных словах. Правапіс складаных слоў, якія маюць у сваім складзе больш за дзве часткі.

17. Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных.

18. Правапіс *д-дз, т-ц*.

19. Правапіс спалучэнняў зычных.

20. Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных.

21. Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных.

22. Правапіс змякчальнага мяккага знака.

23. Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.

24. Правапіс зычных у прыстаўках. Правапіс прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, раз- (рас-), с- (з-), уз- (ус-), із-, без-, небез-, абез-, праз-, цераз-*. Правапіс зычных на стыку прыстаўкі і кораня. Перадача на пісьме спалучэнняў літар *сч, сш, сшч, зж*, здж на стыку прыстаўкі і кораня.

25. Правапіс прыставак *су-, са-, дэз-, дыс-, суб-*. Правапіс прэфіксоідаў *(звыш-, між-, пан-, супер-, транс-, контр-, экс-).*

26. Правапіс некаторых суфіксаў назоўнікаў (*-ец-/-ац-, -іц-/-ыц-, -ак-/-ек-, -ык-/-ік-, -ань-/-ень-, -чык-/чыц-, -шчык-/-шчыц-, -чын-/-шчын-, -ств-*).

27. Правапіс суфіксаў прыметнікаў (*-еньк-/-аньк-/-эньк; -н-/-энн-/-енн-; -ан-/-ян-, - ск-*).

28. Правапіс суфіксаў дзеясловаў (*-ава-/-ява-/-ва-; -ыва-/-іва-*). Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў (*-н-, -ен-, -ан-*).

29. Правапіс зычных на стыку марфем.

30. Правапіс складаных слоў і вытворных ад іх з пачатковымі іншамоўнымі часткамі *авія-, агра-, астра-, аўдыя-, аўта-, аэра-, бія-, варыя-, вела-, відэа-, гама-, геа-, грам-, заа-, кіна-, макра-, медыя-, мота-, неа-, палеа-, радыё-, сацыя-, спарт-, стэрэа-, танц-, тэле-, фота-, электра-* і інш.

31. Правапіс слоў з пачатковай часткай *поў- (паў-).*

32. Правапіс слоў з прыстаўкамі і падобнымі да прыставак пачатковымі часткамі: *а-, анты-, арта-, архі-, гіпер-, дыс-, дэз-, звыш-, інтэр-, інфра-, квазі-, контр-, мета-, між-, мілі-, пан-, паст-, псеўда-, сін-, супер-, транс-, ультра-, экс-, экстра-* і інш.

33. Правапіс складаных слоў, першай часткай якіх з'яўляюцца лічэбнікі.

34.Правапіс складаных назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў.

35. Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў слоў.

36. Правапіс складаных прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Правапіс выклічнікаў.

37. Правапіс часціц *не (ня)* і *ні* з назоўнікамі, прыметнікамі, займеннікамі, дзеясловамі, дзеепрыметнікамі і дзеепрыслоўямі.

38. Ужыванне і правапіс вялікай і малой літар. Ужыванне вялікай літары ў залежнасці ад месца слова ў тэксце. Ужыванне вялікай літары ва ўласных імёнах (уласныя імёны асоб, мянушкі жывёл, геаграфічныя назвы, астранамічныя назвы, назвы гістарычных эпох і падзей, геалагічных перыядаў, назвы свят, знамянальных дат, назвы ўзнагарод, назвы літаратурных, музычных твораў, карцін, кінафільмаў, друкаваных выданняў, назвы ўстаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, аб'яднанняў). Правапіс вялікай літары ў прыметніках, утвораных ад уласных імёнаў. Вялікая літара ў складанаскарочаных словах.

39. Правапіс канчаткаў назоўнікаў першага скланення.

40. Правапіс канчаткаў назоўнікаў другога скланення.

41. Правапіс канчаткаў назоўнікаў трэцяга скланення.

42. Правапіс канчаткаў назоўнікаў рознаскланяльных назоўнікаў мужчынскага роду на *-а(-я).*

43. Ступені параўнання якасных прыметнікаў.

44. Ужыванне лічэбнікаў з назоўнікамі.

45. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у беларускай мове.

46. Асаблівасці дзеяслоўнага кіравання. Некаторыя выпадкі каардынацыі дзейніка і выказніка.

47. Знакі прыпынку ў канцы сказа. Правілы пастаноўкі кропкі. Правілы пастаноўкі пытальніка. Правілы пастаноўкі клічніка.

48. Працяжнік у простым сказе. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Інтанацыйны працяжнік. Працяжнік у няпоўным сказе.

49. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку ў сказах з абагульняльным словам.

50. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі даданымі членамі.

51. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах, зваротках, пабочных і ўстаўных канструкцыях.

52. Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іншых слоў у сказе.

53. Коска пры выклічніках і гукапераймannях.

54. Коска пры сцвярджальных, адмоўных і пытальных словах.

55. Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах.

56. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі.

57. Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з аднатыпнымі часткамі. Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах з разнатыпнымі часткамі.

58. Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

59. Простая мова і знакі прыпынку пры ёй. Знакі прыпынку ў сказах з ускоснай мовай. Правілы афармлення няўласна-простай мовы. Цытаты і правілы іх афармлення.

60. Віды афіцыйных папер і агульныя патрабаванні да іх.

# ПРЫКЛАДЫ
# КАМПЕТЭНТНАСНА-АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 1.

*Выпішыце словы з падвоенымі зычнымі. Растлумачце, чым марфалагічнае падваенне адрозніваецца ад фанетычнага падаўжэння.*

Бязлюддзе, смяяцца, багацце, аддаляцца, асенні, ззянне, абяззброіць, юннаты, дрэнна, дзённа, карэнне, узбіраецца, аддае, вясенні, сталлю, раззлавацца, узбіраецца.

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 2.

*Адзначце, якія назоўнікі ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак -а(-я). Растлумачце, ад чаго залежыць выбар канчатка.*

Кампрэс, кантракт, кантраст, кодэкс, конкурс, контур, крос, ляднік, маршрут, матч, пракос, рэйд, рэйс, статут, суботнік, табар, яблык, хлеб, экзамен, суфікс, тэкст.

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 3.

*Запішыце сказ, расстаўце знакі прыпынку і растлумачце іх.*

Нават мурашнік што трапіўся на вочы і то варушыўся выпаўзалі грэліся на сонцы мурашкі пакуль яшчэ надта павольныя і вялыя пасля зімовай спячкі (Б. Сачанка).

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 4.

*Перакладзіце словы на беларускую мову і растлумачце правапіс* ***о, а*** *ў складаных словах.*

Белолицый, всеобщий, добросовестный, деревообработка, жизнерадостный, лесозащитный, многолетний, новостройка, общеизвестный, пятилетие, черноглазый, четырёхэтажный.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Беларуская дыялекталогія”, “Сучасная беларуская літаратурная мова” , | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі (пратакол № __ ад _________ г.). |